Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2024-09-13

водгалас

# Захоўваць нацыянальную ідэнтычнасць

**У Цэнтры даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН прайшоў III Міжнародны навуковы кангрэс беларускай культуры.**

На ўрачыстым пасяджэнні выступілі акадэмікі У. Гусакоў, А. Лакотка, А. Каваленя, кандыдат гістарычных навук з Санкт-Пецярбурга Марыя Спірына і іншыя.

Выступленні даследчыкаў праходзілі ў наступных секцыях: нацыянальная мова, літаратура і культура, культура этнічных супольнасцей і рэгіёнаў, кіна-, відэа- тэатральнае мастацтва, музычнае мастацтва, выяўленчае, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і дызайн.

У Міжнародным кангрэсе ўдзельнічалі кітайскія студэнты і аспіранты Сюй Цзінань, Чэн Сюйжун, Лю Юйлін, якія вывучаюць беларускую культуру, мастацтва і музыку.

6 верасня з дакладамі выступілі беларускія літаратуразнаўцы Галіна Тычка, Ігар і Жанна Шаладонавы ды іншыя. У гэты ж дзень праходзіў круглы стол «Харавое мастацтва як феномен нацыянальнай культуры» з удзелам вядомых мастацтвазнаўцаў і музычных даследчыкаў. Гаворка ішла пра развіццё харавога мастацтва ў Беларусі з 1990-х гадоў, правядзенне міжнародных харавых фестываляў, творчыя кантакты паміж выканаўцамі і дзеячамі культуры, міжнародную камунікацыю, папулярызацыю беларускай нацыянальнай музыкі і твораў беларускіх кампазітараў у інтэрнэце і сродках масавай інфармацыі. Падчас дыялогу музыказнаўцаў падчас круглага стала нарадзілася ідэя стварэння віртуальнай платформы, якая б папулярызавала нацыянальнае харавое мастацтва.

Шляхі папулярызацыі беларускай музыкі і твораў беларускіх кампазітараў абмяркоўвалі загадчыца аддзела музычна-выканальніцкага мастацтва Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Галіна Цмыг, педагог, доктар мастацтвазнаўства Ларыса Густова-Рунцо і выкладчык кафедры харавога дырыжыравання БДАМ Святлана Герасімовіч. З цікавымі дакладамі выступілі аспіранты Лізавета Зямскова і Ірына Папова, якія вувучаюць феномен беларускага харавога мастацтва.

**Эла ДЗВІНСКАЯ**